Такі падыход дазваляе перадаць дынаміку батальных сцэн, іх непрадказальнасць, насычанасць кожнага моманту. Часам здаецца, што дзеянні адбываюцца настолькі хутка, што гэта не дазваляе дакладна прасачыць за часавай працягласцю бою.

Цэнтральнае месца ў творчасці Э. М. Рэмарка і М. Гарэцкага займаюць гуманістычныя ідэі. Менавіта таму тыпалагічныя сыходжанні паміж творамі М. Гарэцкага і Э. М. Рэмарка можна разглядаць праз прызму аспектаў, што заклалі аснову развіцця ідэй гуманізму XX стагоддзя. *Філасофска-антрапалагічны аспект* знаходзіць сваё адлюстраванне ў матыве “страчанага пакалення”. Рэальныя памкненні юнакоў знайсці сваё месца ў свеце перакрэсліваюць ваенныя падзеі. Таму рэалізацыя сябе ў ролі, адрознай ад салдацкага статусу, становіцца амаль немагчымай, а наперадзе іх чакае пустэча: “Люди постарше крепко связаны с прошлым, у них есть почва под ногами, есть жены, дети, профессии и интересы; эти узы уже настолько прочны, что война не может их разорвать. У нас же, двадцатилетних, есть только наши родители, да у некоторых – девушка”. Думкі герояў аб сустрэчы з бацькамі і блізкасці роднага дома выратоўваюць іх падчас бітваў, але ў рэальнасці вяртанне аказваецца разбуральным і яшчэ больш раніць скалечаныя душы. Персанажы раманаў М. Гарэцкага і Э. М. Рэмарка не знаходзяць сабе месца дома. Таму ўсё часцей ім сняцца франтавыя будні, усё больш думаецца пра саслужыўцаў і з такой ахвотай чытаюцца імі лісты з фронту.

Праведзены аналіз творчасці М. Гарэцкага і Э. М. Рэмарка сведчыць пра духоўнае падабенства творцаў – інтэлігенты ў першым пакаленні, яны атрымалі царкоўную адукацыю, выхоўваліся ў падобных умовах.

УДК 811.161.3’374.81

Вуч. З.А. Яркіна
Навук. кір. Т.А. Шуманская, намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце
(ДУА “Гімназія № 3 г. Салігорска)

## БЕЛАРУСКІЯ ЭЛЕКТРОННЫЯ СЛОЎНІКІ: СТРУКТУРНА-ЗМЕСТАВЫЯ АСАБЛІВАСЦІ, ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ

**Мэта і задачы даследавання.** *Мэта працы* – ахарактарызаваць сучасны стан беларускай камп’ютарнай лексікаграфіі і спрагназаваць магчымыя вектары яе далейшага развіцця.

Дасягненне пастаўленай мэты прадугледжвае вырашэнне наступных *задач*:

– вызначыць месца камп’ютарнай лексікаграфіі сярод іншых лінгвістычных навук, прааналізаваць сучасны стан і асноўныя вектары развіцця камп’ютарных тэхналогій у сусветнай і айчыннай лінгвістыцы;

– максімальна поўна выявіць і сістэматызаваць існуючыя на сённяшні дзень беларускія электронныя слоўнікі;

– ахарактарызаваць кампазіцыйныя асаблівасці беларускіх электронных слоўнікаў  і стварыць іх перспектыўную структурна-функцыянальную тыпалогію;

– паспрабаваць распрацаваць самастойны лексікаграфичны праграммны прадукт.

**Актуальнасць** даследавання абумоўлена тым, што ў цяперашні час у мовазнаўстве адсутнічае дэталёвае і комплекснае даследаванне электронных слоўнікаў беларускай мовы. Гэта ставіць на парадак дня праблему сістэматызацыі існуючых лексікаграфічных праграмных прадуктаў, а таксама аналіз стану беларускай электроннай лексікаграфіі.

**Гіпотэза.** На сучасным этапе развіцця беларускай лінгвістыкі электронная лексікаграфія з’яўляецца мала распрацаванай галіной.

На падставе аналізу айчыннай і замежнай навуковай літаратуры па праблемах даследчай работы была створана аналітычная мадэль аналізу электронных слоўнікаў зыходзячы з іх функцыянальнага боку, а найбольш важныя хрstates характарыстыкі разгрупіраваны на пяць вялікіх катэгорый-падгруп: *выкарыстанне, змест, мультымедыйны аспект, пошук, тэхнічныя функцыі.*

Аналіз разастайных электронных слоўнікаў дазволіў нам прапанаваць наступную іх тыпалогію:

1) слоўнік, які ўяўляе сабой тэкставы файл, што ўзнаўляе старонкі традыцыйнага папяровага слоўніка;

2) слоўнік-праграма, размешчаны на камп’ютары карыстальніка;

3) слоўнік-праграма на выдаленым серверы;

4) слоўнік на ўласным камп’ютары як форма, якая звяртаецца да сервера;

5) слоўнік-праграма ў спецыялізаваных прыладах, напрыклад, слоўнікі для кішэннага камп’ютара;

6) слоўнік як спецыялізаваны праграмна-апаратны комплекс.

У выніку аналізу сямідзесяці шасці электронных слоўнікаў былі сфармуляваны вынікі па пастаўленым мэтам і задачам:

Асноўнай перавагай электроннага слоўніка, у параўнанні з папяровай версіяй, з'яўляецца гнуткае кансультаванне, лёгкае маніпуляванне, разнастайныя магчымасці пошуку, тэхнічныя і практычныя функцыі;

Аналіз сучаснага набору слоўнікаў, якія распрацоўваюцца ў нашай краіне і / або ўключаны ў розныя аўтаматызаваныя слоўнікавыя сістэмы, дазваляе фіксаваць іх адставанне ад сучаснага развіцця навукі і тэхнікі, неадпаведнасць асноўным кірункам развіцця многіх галін ведаў;

Электронныя слоўнікі беларускай мовы валодаюць, у асноўным, аднолькавымі базавымі складнікамі. Тым не менш, некаторыя з іх адрозніваюцца сваёй прэзентацыяй, сваімі пошукавымі магчымасцямі і тэхнічнымі характарыстыкамі.

З дапамогай распрацаванай аналітычнай табліцы, былі даследаваны асноўныя электронныя слоўнікі беларускай мовы. Вынікі аналізу даюць нам падставы казаць, што камп’ютарныя слоўнікі айчынных лексікографаў з’яўляюцца недастаткова распрацаванымі. На дадзены прамежак часу online-слоўнік «BelMova» з’яўляецца найбольш прыдатным праграмным прадуктам сярод электронных перакладных слоўнікаў беларускай мовы. Электронны тлумачальны слоўнік, змешчаны на сайце «Роднае слова», лепшы сярод сваіх канкурэнтаў.

У цэлым будучыя кірункі беларускай лексікаграфіі бачацца:

а) ва ўдасканаленні існуючых тыпаў слоўнікаў;

б) у стварэнні новых тыпаў слоўнікаў на аснове новых прынцыпаў і задач, якія паўстануць перад праграмнымі прадуктамі;

в) у аб’яднанні ўжо вядомых тыпаў слоўнікаў у новыя слоўнікі-комплексы;

г) у стварэнні камп’ютарнай метадалогіі лексікаграфічнай дзейнасці на аснове машынных фондаў моў і інш.

Матэрыялы даследавання маюць тэарэтычную і практычную каштоўнасць і могуць выкарыстоўвацца пры далейшым навуковым асэнсаванні праблемы складання электронных слоўнікаў, пры падрыхтоўцы семінараў і спецкурсаў, стварэнні падручнікаў, метадычных дапаможнікаў і вучэбных праграм, а таксама пры напісанні курсавых і дыпломных прац студэнтамі-філолагамі.